Таким образом, связь между религией и литературой представляет собой глубокий и важный аспект культурного наследия человечества. Религиозные темы, символы и мотивы в литературе не только отражают влияние духовности на мышление и культуру, но и помогают людям лучше понять свое место в мире и размышлять о вечных вопросах. Творчество Анны Ахматовой является примером тесной связи между религией и литературой, христианские образы и мотивы играют значительную роль в выражении внутренних переживаний и духовных убеждений автора. Слова с религиозной коннотацией – *крест, крестик, крестный, креститься* – приобретают в произведениях Анны Ахматовой особую глубину и эмоциональную насыщенность: с одной стороны, символизируют веру и спасение, с другой – тяжелые испытания, страдания и духовною борьбу. Христианские образы, созданные с использованием данных лексических и фразеологических единиц, открывают широкий спектр эмоциональных и философских аспектов, которые пронизывают творчество Анны Ахматовой.

**Литература**

1 Ушакова, С. Языковые образные средства в поэзии / С. Ушакова. – Белгород : НИУ «БелГУ», 2018. – 73 с.

2 Национальный корпус русского языка [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ruscorpora.ru. – Дата доступа: 12.03.2024.

3 Современный толковый словарь русского языка Ефремовой [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://dic.academic.ru/dic.nsf/efremova/. – Дата доступа: 12.04.2024.

4 Фразеологический словарь русского литературного языка [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://phraseology.academic.ru/. – Дата доступа: 12.04.2024.

5 Православный энциклопедический словарь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pravoslavniy_slovar.academic.ru/. – Дата доступа: 14.03.2024.

**821.161.3-14*Я.Сіпакоў**

***Е. Ю. Новікава***

## ЖАНРАВА-СТЫЛЁВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ІНТЫМНАЙ ЛІРЫКІ ЯНКІ СІПАКОВА

*Артыкул прысвечаны аналізу жанрава-стылёвых асаблівасцей інтымнай вершатворчасці Янкі Сіпакова. Аўтар разглядае асноўныя класічныя жанры, такія як санет, балада, ода, элегія, вянок санетаў. Робіцца выснова, што, захоўваючы рытмічна-кампазіцыйныя законы пералічаных відаў і жанраў лірыкі, паэт свядома імкнецца да высокага стылю, каб раскрыць складаныя пытанні сутнасці жанчыны і яе жыццёвага прызначэння. У вершах-філасафемах Я. Сіпакоў імкнуўся асэнсаваць каханне як экзістэнцыйную праблему.*

Тэма кахання – адна з асноўных у творчасці Я. Сіпакова. Важнасць вобраза жанчыны паэт падкрэслівае ў вершы “А мы з табой, бы ў рай, у гэткі…”, ідэя якога ў тым, што ўсё на свеце павінна жыць у пары: *Лятаюць мятлушкі па пары, / Па пары – лашчацца кветы. / І мне з табой шчасліва марыць. / Пра ўсё вось з гэтай ціхаты* [1, с. 56]. Звяртаючыся да інтымнай праблематыкі, Я. Сіпакоў выкарыстоўвае даволі вялікі спектр лірычных жанраў і відаў.

Так, твор “Вяселле” напісаны ў фальклорным стылі. Гэта балада-песня, трэн-плач, прасякнуты пакутлівым болем і любоўю і павагай да сілы пачуцця тых людзей, якія нават у экстрэмальных умовах захавалі сваё каханне. Верш напісаны ў форме паслядоўных зваротаў нявесты да дня, вечара, ночы, раніцы, сонца з просьбай затрымацца на імгненне,

падоўжыць хоць на хвіліну яе свабоду, якая скончыцца для дзяўчыны разам з заўтрашнім вяселлем, бо "За раба я выходжу, за Яна, / І рабою раблюся сама" [1, с. 34]. Дзяўчына цалкам разумее, што яна згубіць права распараджацца сваім лёсам пасля вяселля. Але гераіня твора свядома ахвяруе сваім лёсам і свабодай, кладучы іх на алтар кахання.

Я. Сіпакоў аднолькава паспяхова карыстаўся рознымі жанрамі: драматычнымі баладамі, сцішанымі ў сваім гучанні элегіямі, прыўзнятымі одамі. Ода, як вядома, у перакладзе з грэчаскай мовы азначае ўрачысты верш у гонар нейкай гістарычнай падзеі або выбітнай асобы. З дапамогай гэтага жанру паэт здолеў не толькі ўславіць гераічныя ўчынкі і подзвігі славутых людзей, але і даць выверaную, філасофска значную ацэнку шараговым грамадскім і маральным з'явам, засяродзіцца на агульначалавечых праблемах, а таксама ўзняць пачуццё кахання і вобраз жанчыны на адпаведную жанравай зададзенасці вышыню. Да прыкладу, у вершы "Жанчына спявае" Я. Сіпакоў усхваляе спеў жанчыны, які можа пераадолець усе "крыўды і плёткі" і стаць крыніцай гармоніі ў свеце і ў душы лірычнага героя: "*Для песні трэба прычына, / Для песні трэба нямала... / Шануйма ж гэтак жанчыну, / Каб яна і у будні спявала!*" [1, с. 159]. Верш гэты, безумоўна, мае адычны характар, істотна падмацаваны клічнай інтанацыяй. Твор мае адметную кампазіцыю: першая частка пабудавана як апісанне, а другая ўяўляе сабой непасрэдны зварот да чытача. І гэта сведчыць пра сінтэз у ім адзнак выяўленчай і эталагічнай паэзіі, наяўнасць пэўных дыдактычных інтанацый.

Я. Сіпакоў звяртаецца да адной з самых складаных цвёрдых форм верша – санета, чатырнаццацірадковіка з двух чатырохрадкоўяў і двух трохрадкоўяў, аб'яднаных пэўнай рыфмоўкай (італьянская форма санета) ці з трох катрэнаў і аднаго двухрадкоўя (англійская форма). "Пад яго пяром санет як пераважна «інтымны» жанр не раз выяўляў свае магчымасці песеннага звонкагалосся, эмацыянальнага багацця, традыцыйна замацаванай строгай прыгажосці, зграбнасці сваёй формы" [2, с. 53], – зазначае А. Лысенка. Але Я. Сіпакоў часам адступае ад правіл і канонаў санетнага вершаскладання. "Санет кахання" Я. Сіпакова – узор пранікнёнай інтымнай лірыкі – уяўляе сабой англійскую (шэкспіраўскую) разнавіднасць і складаецца з трох катрэнаў і аднаго ўкарочанага двухрадковага тэрцэта і другога катрэна. У першых васьмі радках санета, згодна з канонамі жанру, развіваецца лірычная сітуацыя, а ў апошніх заключаны вывад. Найбольшая сэнсавая нагрузка прыпадае на так званы "санетны замок" – апошні радок верша:

*І я заўсёды буду берагчы*
*Тваю цнатлівасць светлую аддана.*
*Ты не саромейся мяне.*
*Бо ты адна, лічы,*
*Ў маім санеце беражна схавана* [1, с. 81].

Я. Сіпакоў, як і многія беларускія паэты, асэнсоўвае каханне не толькі як прыватны досвед лірычнага суб'екта, але і як феномен, як экзістэнцыйную праблему. Як адзначае А. Анцімонік, аналізуючы інтымную лірыку "шасцідзясятнікаў", "каханне – як правіла, шчаслівае і ўзаемнае – становіцца той сілай, якая дапамагае лірычным героям пераадолець балансаванне ўласнай экзістэнцыі паміж уладкаванасцю і неўладкаванасцю жыцця, упэўненасцю і няўпэўненасцю ў сабе і свеце" [3, с. 21]. Каханне як экзістэнцыйная, а не інтымная праблема суадносіцца ў лірыцы Я. Сіпакова з філасофскімі катэгорыямі смерці, самаспазнання, пошуку мэты і сэнсу жыцця, асэнсоўваецца як пакута, самота, роспач. Глыбокія інтымныя пачуцці ў лірыцы паэта становяцца асноватворнымі для быцця чалавека.

*Ісці к табе трывожна і спакусна,*
*Нібыта набліжацца да агню,*
*І загарэцца ад тваіх спякотных вуснаў,*
*І спапяліць цнатлівую браню.*
*І ўвайсці ў агонь. Пламеннем задыхацца,*
*Лавіць яго, і жыць, і дыхаць ім.*
*Згарэць на попел. З попелу ўзняцца,*
*Каб зноў глытаць агню вярэдны дым* [1, с. 78].

("Каханне")

Герой працытаванага вышэй верша Я. Сіпакова перакананы, што толькі каханне надае сэнс чалавечаму існаванню і з'яўляецца ірацыянальным феноменам, што, як ні дзіўна, здольнае згубіць чалавека, выпрабоўваючы яго на трываласць: "Бо толькі так і можна жыць на свеце: / Згарэўшы ўшчэнт, застацца зноўку жыць" [1, с. 225]. Аднак падобнае ўяўленне пра знітаванасць Эрасу ("інстынкту жыцця") і Танатасу ("інстынкту смерці") не набывае ў паэзіі Я. Сіпакова выгляд парадоксу, супярэчлівасці. Падобныя суадносіны былі вытлумачаны яшчэ З. Фрэйдам: "<…> агрэсіўныя імкненні ніколі не існуюць самі па сабе, але заўсёды спалучаны з эратычнымі" [4, с. 114].

Вяршыняй інтымнай лірыкі Я. Сіпакова з'яўляецца вянок санетаў "Жанчына", што складае адну з ідэйна-сэнсавых дамінант зборніка "У поўдзень да вады" (1976 г.). Твор мае цыклічную форму, увасабленне якой патрабуе ад творцы карпатлівасці і майстэрства, дасканалага валодання словам і законамі вершаскладання. Вянок санетаў складаецца з пятнаццаці звязаных паміж сабой – сэнсава, рытмічна, кампазіцыйна – вершаў. Магістрал – пятнаццаты, заключны, санет – складаецца з першых радкоў папярэдніх санетаў. Кожны наступны санет пачынаецца радком, якім заканчваецца папярэдні. Такім чынам, ствараецца арыгінальнае архітэктанічнае кальцо, аб'яднанае градацыйным развіццём лірычнай думкі.

А. Лысенка, хаця і заўважае пэўныя адступленні ад чысціні жанру (пэўную адвольнасць рыфмы, тэматычную блізкасць суседніх санетаў), усё ж адзначае, што "вянок Я. Сіпакова мае свае перавагі, якія кампенсуюць прыватныя недахопы" [2, с. 54]. Я. Сіпакоў у вянку санетаў стварае гімн жанчыне як увасабленню і вытоку жыцця, сімвалу любові і шчасця, сіноніму чысціні і вечнай жаноцкасці. Асобна адзначаецца роля мацярынства: "А ты – святая, як сама любоў / – Раджала фараонаў і рабоў, / Каб жыццядайнасць не магла спыніцца" [1, с. 201].

У сваім вянку санетаў Я. Сіпакоў узняў жанчыну на высокі п'едэстал, аднак гэтая сакралізацыя мае не адцягнена-абстрактны, а канкрэтны, зямны характар. Паэт стварае арэол святасці і прыгажосці вакол жанчыны, увасабляе гэты вобраз у розных іпастасях – Маці, Каханай, Жонкі. Пры дапамозе такой вытанчанай і складанай формы, як вянок санетаў, паэт імкнуўся ўславіць дабрыню, хараство і высокае прызначэнне Жанчыны:

*Каб жыццядайнасць не магла спыніцца,*
*Ты ў гэтым свеце хараства жывеш.*
*Пакуль ты ёсць – працяг наш будзе віцца*
*За далеч часу – без канца, без меж* [1, с. 203].

Цыкл напісаны традыцыйным для санетаскладання пяцістопным ямбам і мае задуму паэта паказаць саму жанчыну і яе жыццё не статычна, а ў развіцці, у руху. Таму кожнаму санету можна даць назву, што злучыць яго з наступным і папярэднім: "Сустрэча" – "Саюз двух" – "Дабрыня" – "Мадонна" – "Цяжкі крыж маці" – "Шматаблічнасць" – "Нязгасная прыгажосць" – "Пакланенне" і г. д. Завяршае свой вянок санетаў Янка Сіпакоў адмысловай "Магістраллю". Карэктная назва гэтай часткі – "магістрал", і пішацца ён звычайна да стварэння цыкла, але паколькі яго завяршае, то ствараецца ўражанне арганічнага і нечаканага яго самаўзнікнення. Магістрал вызначае ідэйную задуму вянка санетаў:

*Ад рук, ад вуснаў, ад вачэй тваіх*
*Няма нічога ласкавей на свеце.*
*З'яднала нас прырода удваіх,*
*І мы дабрэем пры табе, як дзеці.*
*Тваё жыццё – як бліскавіцы міг,*
*Твая усмешка век нам цёпла свеціць.*
*Спяшаем да цябе з нягод усіх,*
*Як на кругі свае спяшае вецер.*

*А ты – святая, як сама любоў –*
*Раджала фараонаў і рабоў,*
*Каб жыццядайнасць не магла спыніцца.*
*Ты – маці, жонка; ты – дачка, сястра,*
*Твая заўсёды гожая пара.*
*Дазволь, жанчына, ў ногі пакланіцца* [1, с. 205].

Адметна, што цыкл санетаў напоўнены нязвыклай для паэзіі свайго часу пачуццёвасцю. Улічваючы той факт, што "інтымны свет беларусаў увогуле вылучаецца большай стрыманасцю і цнатлівасцю ў параўнанні нават з блізкімі суседзямі, а нацыянальны эрас мае шляхетны і далікатны характар" [5, с. 59], як адзначае Ю. Пацюпа, выглядае заканамернай несфарміраванасць устойлівай традыцыі ва ўвасабленні эратычных матываў у айчыннай паэзіі XX стагоддзя. Нягледзячы на тое, што некаторыя сучаснікі М. Багдановіча, да прыкладу, У. Жылка ці З. Бядуля, падхапілі пачынанне паэта, у савецкі перыяд такія вершы былі хутчэй факультатыўнымі, адзінкавымі з'явамі. Вянок санетаў "Жанчына" Я. Сіпакова якраз і з'яўляецца выключэннем з агульнага правіла. Каханне ў цыкле паказана вельмі натуральна: "*Я да цябе, сасмяглы ўвесь, прынік, / Ты да мяне, шчаслівая, прынікла, / І радасная тоеснасць, бы крык, / На ўсе вякі адна – адна! – узнікла*" [1, с. 201]. Вобраз жанчыны ва ўспрыманні лірычнага героя не губляе, аднак, сваёй чысціні і цноты ў вершах падобнага гучання. Мужчына змагаецца са сваёй спакусай і ўсведамляе мяккую ўладу жанчыны.

Такім чынам, у інтымнай лірыцы Янка Сіпакоў з аднолькавым поспехам карыстаецца рознымі класічнымі жанрамі: баладай, элегіяй, одай, філасафемай інш. Паэт паслядоўна звяртаецца і да больш складанай цвёрдай формы верша – санета. Вянок санетаў "Жанчына" Я. Сіпакова – адзін з лепшых цыклаў у яго паэтычнай спадчыне – уяўляе сабой гімн жанчыне, раскрывае яе сутнасць і прызначэнне, місію на Зямлі. Паэт па-філасофску атаясамлівае паняцці кахання і жыцця, бо менавіта любая жанчына надае яму сэнс і кірунак. Разам з тым вобраз лірычнай гераіні ў Я. Сіпакова надзелены нязвыклай для тагачаснай літаратуры пачуццёвасцю, у яе апісанні прысутнічаюць відавочныя прыкметы эратызму.

## Літаратура

1 Сіпакоў, Я. Выбраныя творы : у 2 т. / Я. Сіпакоў. – Мінск : Маст. літ., 1995. – Т. 1. – Паэзія. – 431 с.

2 Лысенка, А. Ф. Лінія гарызонта. Нарыс творчасці Янкі Сіпакова / А. Ф. Лысенка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 119 с.

3 Анцімонік, А. В. Экзістэнцыйныя праблемы ў лірыцы Я. Сіпакова / А. В. Анцімонік // Роднае слова. – № 1. – С. 20–21.

4 Фрейд, З. Влечения и их судьба / З. Фрейд ; пер. М. В. Вульф, Р. Ф. Додельцев. – Москва : ЗАО Изд-во «ЭКСМО–Пресс», 1999. – 432 с.

5 Пацюпа, Ю. Зайгранне, або Ярныя (эратычныя) матывы ў ранняй творчасці Янкі Купалы і Максіма Багдановіча / Ю. Пацюпа // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : матэрыялы навуковай канферэнцыі, Гродна, 4–6 кастрычніка 1995 г. / Гродненскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы; рэдкал. : І. Жук [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 1996. – С. 52–60.

**УДК 821.161.3**

***В. Ю. Плешавеня***

# ЛЮДМІЛА РУБЛЕЎСКАЯ: АД ПАЭЗІІ ДА ПРОЗЫ

*Артыкул прысвечаны асэнсаванню спецыфікі мастацкай манеры сучаснай беларускай пісьменніцы Людмілы Рублеўскай. Разгледжаны творчы шлях аўтаркі ад пэ-*